Мужчыны дамагаюцца ад жанчын *цнатлівасьці*. Мужчынам падабаецца разбураць. Бо разбурэньне — гэта авалодваньне. Зруйнаваць — значыць апанаваць. Расейцы насадзілі сваю ўладу ў Беларусі, ламаючы ўсе нашы *цноты* — ад цэркваў і ратушаў да ляндшафтаў і правапісу. Калі Купалава „Раскіданае гняздо" мэтафара, дык гэта мэтафара зваяванай і падуладнай краіны. Паніч дурыць галаву Зосьцы, а Сымонка грае на скрыпачцы... Імпэрская ідылія!

Ёсьць нешта рамантычнае ў слове „*цнота*" і нешта трагічнае ў слове „*цнатлівасьць*".

Беларусы й цяпер застаюцца ў стане вартай жалю мужчынскай *цнатлівасьці*. Вобразна кажучы, у Беларусі няма алькагалізму, у Беларусі спойваюць малалетак.

# Цукар

***Сяржук Сокалаў-Воюш***

*Цукар* — слова заходняе, нямецкае. Затое сам *цукар* мы маем свой — беларускі, зроблены з *цукровых буракоў*. Хто зь беларусаў не прайшоў буракова выхаваньня! Побач з калгасьнікамі стаялі на полі літарай Г і зьбіралі салодкі ўраджай рабочыя, студэнты, школьнікі, вайскоўцы і навукоўцы. Хто-хто, а яны добра ведаюць горкую цану збору *цукровых буракоў*. У савецкія часы нашыя буракі, з ідэйных прычынаў, здалі свае салодкія пазыцыі ідэйна блізкаму кубінскаму *цукроваму трысьнягу*, зь якога братні кубінец вырабляў і прысылаў нам жоўты *цукар*.

Апрача *цукровых буракоў* у Беларусі вядомыя *цукровы гарох* і *цукровы боб*. Ад слова *цукар* паходзяць *цукернік, цукраварня і цукерка*. Прымаўка кажа, што саладзейшыя за *цукар* для беларуса толькі сон і каханьне.

Дома дзеці бралі *цукар* у лыжку, грэлі яе на агні. *Цукар* плавіўся, пеніўся, і зь яго выплаўляліся брунатныя, хрумсткія з прысмакам дыму лізунцы. Падфарбаваныя ў розныя колеры, але зробленыя тым самым спосабам пеўнікі на палачках прадавалі на вуліцах цёткі.

А ў гэты самы час іншыя дарослыя бралі 20 грамаў дрожджаў, 10 літраў вады, 5 кіляў *цукру* і... Але гэта ўжо не пра *цукар*.

# Цывілізацыя

***Валянцін Акудовіч***

*Цывілізацыя* — гэта калі куды вокам ні кінь, усюды бачна ня створанае Богам, а зробленае рукамі чалавека.

Напрыканцы XX стагодзьдзя зямная куля, як цесны пакой, спрэс застаўленая людзкім наробкам. І гэты рукатворны сьвет ужо мае сваю веру — тэхнічны прагрэс, свайго Бога — атамную бомбу, свой судны дзень — ядравы апакаліпсыс.

Тут усё амаль як і ў тым, нерукатворным. З адной толькі розьніцай — Бог стварыў белы сьвет для птушак, зьвяроў, Адама і Эвы, а чалавек выштукаваў *цывілізацыю* выключна дзеля самога сябе.

6 мільярдаў людзей штодня завіхаюцца ля камбайну сусьветнай *цывілізацыі*, каб забясьпечыць хлебам і камфортам свой біялягічны від. Пэўна, з гэтага можна цешыцца. Ах, што за асілак гэты маленькі чалавек, які стварыў такую магутную *цывілізацыю*!